УДК 821.161.3

**У. М. Сахарук**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*А. І. Белая*

# РАМЕСНІК ЯК САЦЫЯЛЬНЫ І МАСТАЦКІ ТЫП У ТВОРАХ АЙЧЫННАЙ ПРОЗЫ

**Уводзіны.** Рамеснікі ва ўсе часы забяспечвалі побытавымі прыладамі і рэчамі жыццё людзей. У сацыяльнай пірамідзе яны не займаюць вышэйшай ступені, але трымаюцца асобна сярод іншых прафесій. Вобразы рамеснікаў адносяцца да літаратурнага тыпу «маленькага чалавека», які ўзнік яшчэ ў ХІХ стагоддзі як паказчык асобы невысокага сацыяльнага становішча, але постаці пазітыўнай, неабыякавай да агульначалавечых, агульнабыццёвых праблем. Пісьменнікі-гуманісты з павагай адносяцца да рамеснікаў, бачаць у іх носьбітаў філасофскага складу мыслення, багатага асабовага патэнцыялу. Культурная велічыня «малога» чалавека часта ўвасабляецца ў мастацкіх тыпах шаўца і краўца.

**Асноўная частка.** У адной з сваіх прац З. Бядуля адзначаў, што краўцы, кавалі, шаўцы былі ў вёсках людзьмі першай важнасці і пашаны, да якіх прыходзілі не толькі па справе, але і так сабе «пагутарыць з разумнымі людзьмі, параіцца аб розных справах» [1, с. 400].

У айчыннай прозе даволі пашыраны матыў шавецкай працы. Шаўцоў нават называлі «рамеснай інтэлігенцыяй». Праца шаўца давала магчымасць выжываць у самыя цяжкія часы. Нездарма Мацей Мышка, герой рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары», лічыць, што «лепей быць шаўцом у Вільні, чым дарэктарам у Брудзянішках» [2, с. 144].

У літаратурных творах праходзіць думка не толькі пра ўмельства шаўцоў і іх сацыяльную запатрабаванасць, а адзначаецца схільнасць прадстаўнікоў гэтай прафесіі да філасофскага ўспрымання свету. Ім уласціва пэўная адстароненасць ад навакольнай рэчаіснасці. Так, безыменнага старога шаўца з рамана К. Чорнага «Сястра» не кранаcomп «і вечныяператварэнні свету, і бунты людскія...» [2, с. 144]. Дасціпны майстра-шавец Юрка Дратва — адзін з галоўных герояў казкі З. Бядулі «Сярэбраная табакерка». «Дратва была яго мянушкай, калі ён вырас і зрабіўся шаўцом» [3].

Казачная форма ў няпросты для пісьменнікаў час давала ім адносную творчую свабоду. У трапных, метафарычных выказваннях шаўца штодзённае, побытавае, узвышаецца да духоўнага, сакральнага. Дасціпны шавец, абыходзячыся мінімумам добра знаёмых яму слоў, акрэслівае шырокае кола каштоўнасцей. «Добрай дратвай» можна замацаваць знаёмства. Само Юркава слова «моцнае, як дратва» [3]. «Разумнага ён называў моцнай дратвай, дурнога — гнілой дратвай» [3]. Тое, што яму падабалася, было «сшыта добрай дратвай»; аб прыгожым ён казаў: «блішчыць, як новая дратва» [3]. Зрабіцца скамарохамі прапануе таксама Юрка, каб «вандраваць па свеце і назіраць, як неўміручыя людзі будуць шыць свой вечны бот жыцця» [3]. Вобраз шаўца рэалізуе матыў устойлівасці быцця, іманентны нацыянальнай карціне свету беларусаў. Будуе гняздо ластаўка, гадуюцца дзеці, шые боты шавец — і жыццё працягваецца [2, с. 145].

Асаблівае месца ў літаратуры належыць краўцу. К. Чорны падкрэслівае што раменнік праз усё жыццё мае не толькі спосаб да жыцця, а і талент у руках. Адным з герояў рамана «Трэцяе пакаленне» пісьменнік зрабіў краўца, які ходзіць па беларускіх вёсках і шые людзям кажухі. Сам ён жыў у маленькай хаце «з адным акном на дарог і без аніякіх… прыбудовак» [4]. Па суседстве з краўцом жыў каваль. У фізічным плане кравец значна адрозніваўся ад дужага каваля, «быў прысутулены, лысы і баяўся холаду». Аднак абодва яны асобы чуйныя і творчыя, дуэтам іграюць на скрыпках.

Грунтоўную характарыстыку вобраза, створанага К. Чорным у рамане «Трэцяе пакаленне», даў вядомы беларускі літаратуразнаўца М. Тычына. На яго думку, тыповы чорнаўскі герой-трапятун, кравец увасабляе ў сваім вобразе і лёсе жыццё большасці беларусаў ва ўмовах поўнага бяспраўя, калі цэлы народ не меў ні ўласнасці, ні зямлі, ні бацькаўшчыны, ні вольнай волі. Кравец абраў сабе прафесію і спосаб жыцця, якія давалі яму хоць невялікую магчымасць быць гаспадаром уласнага лёсу. Баязлівы, мітуслівы чалавечак, які свой страх і чаканне горшага топіць у бясконцай гаворцы аб усім і ні аб чым, Кравец за часы бясконцага бадзяння па глухіх вёсках і хутарах у пошуку заробку страціў нават уласнае імя і вядомы ўсяму наваколлю сваёй прафесіяй, што стала для яго адначасова і мянушкай-прозвішчам. Так страціў за стагоддзі вандроўкі ў часе сваё імя і сам беларускі народ». Разам з тым, асабовая характарыстыка Краўца ўтрымлівае шмат станоўчых рысаў. Ён «з’яўляецца жывым крытэрыем чалавечнасці ці нялюдскасці навакольнага свету. Яго душа чула адгукаецца на чалавечую дабрату або нядобразычлівасць, спагаду або чэрствасць, любоў або нянавісць». Самая вялікая мара гэтага героя — «убачыць свет людзей, дзе ўсе любяць усіх, дзе кожны бачыць у бліжнім такога ж, як і сам, чалавека, асуджанага на кароткае па часе і поўнае трывог і клопатаў зямное існаванне. Нягледзячы на яго слабавольнасць, няздольнасць да актыўнага супраціўлення несправядлівасці, «капеечную хітрасць», вобраз Краўца захоўвае ў сабе вялікую маральную сілу: яго здольнасць у любых умовах захоўваць вернасць ідэалам дабра, чуласці, чалавечнасці, памятаць пра хрысціянскія запаветы робіць гэты вобраз адным з сапраўдных мастацкіх адкрыццяў Кузьмы Чорнага» [5, с. 357]. Кравец «душу меў мяккую і спачувальную да кожнага, хто такі самы, як ён» [4].

© Сахарук У. М., 2023

Рэпазіторый БарДУ

Класіфікацыя літаратурных асоб па прафесіі не зводзіцца толькі да вызначэння іх сацыяльнай прыналежнасці, а мае і сімваліка-метафарычны сэнс. Як лічыць А. Белая, тып краўца, што хадзіў «па людзях», збліжаецца ў прозе першай трэці XX стагоддзя з тыпам летапісца як асобы разважлівай, неабыякавай да лёсу чалавека і свету. Краўцы насілі з краю ў край навіны і чуткі (так, дзівак Кузёмка, які навучыўся кравецкай справе, у раманах У. Гніламёдава завецца «газета з нагамі»). Паводле Ю. Лотмана, сэнс і роля моманту, падзеі, выпадку раскрываюцца ў інтэрпрэтацыі ўдзельніка, відавочцы, сведкі. Простая мова, уведзеная ў летапіс, была сведчаннем нявыдуманага. Эстэтыка-філасофская вартасць вобраза краўца бачыцца ў тым, што яго канцэпцыя, у адрозненне ад іншых персанажаў рамана «Трэцяе пакаленне», з цягам часу не пацярпела маральна-этычнай пераацэнкі [2, с. 154].

**Заключэнне.** Тып рамесніка мае вялікую значнасць як у матэрыяльнай, сацыяльнай сферы чалавечага жыцця, так і ў нацыянальным мастацтве. Шырока прадстаўлены ў беларускай літаратуры тыпы шаўца і краўца. Кравец і шавец ствараюць і рамантуюць абутак і адзенне, што сімвалічна звязана з транфармацыяй і змяненнем. Яны заклікаты сшываць, сімвалічна змацоўваць расхістаны свет. У прафесійных занятках рамеснікаў увасабляюцца творчы патэнцыял і эстэтычны густ «малых» у сацыяльным маштабе герояў айчыннай прозы. Разгледжаныя намі тыпы ўвасабляюць духоўную сутнасць традыцыйных сацыяльных характараў. Шавец Юрка Дратва ў аповесці З. Бядулі — не толькі адмысловы майстра, але і саматужны філосаф. Вобраз краўца, створаны К. Чорным, карэлюе з вобразам летапісца пераломнай эпохі і па сваім маштабе варты прэтэндаваць на ролю звыштыпа, бо ўвасабляе асновы нацыянальнага характару беларусаў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Бядуля, З.* Выбраныя творы / З. Бядуля ; уклад., прадм., камент. У. Казберука. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2006. — 496 с.

2. *Белая, А. І.* Беларуская проза першай трэці XX ст. : станаўленне сістэмы персанажаў, тыпы і эвалюцыя мастацкіх характараў : дыс. … д-ра філал. навук : 10.01.01 / А. І. Белая. — Мінск, 2019. — 282 л.

3. Змітрок Бядуля [Электронны рэсурс] // Беларуская электронная бібліятэка. Беларуская палічка. — Рэжым доступу: https://knihi.com/Zmitrok_Biadula/Siarebranaja_tabakierka_Kazka.html. — Дата доступу: 10.10.2023.

4. Кузьма Чорны [Электронны рэсурс] // Беларуская электронная бібліятэка. Беларуская палічка. — Рэжым доступу : https://knihi.com/Kuzma_Corny/Treciaje_pakalennie_zbor6.html. — Дата доступу: 10.10.2023.

5. *Тычына, М.* Кузьма Чорны / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Минск : Беларус. навука, 1999. — Т 2: 1921—1941. — С. 330—369.

УДК 811.161.1

**А. А. Тавлуй, В. О. Фабишевская**
*Государственное учреждение образования «Лицей 1 г. Барановичи», Барановичи, Республика Беларусь*

*Научный руководитель*
*А. В. Долмат*

## УПОТРЕБЛЕНИЕ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ И ЭВФЕМИЗМОВ В ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ СФЕРЕ

**Введение.** Русский язык очень богат устойчивыми выражениями. Фразеологические обороты — это особый пласт русского языка, который составляет часть культуры нашего народа. Чувства, восприятие, свое собственное отношение к происходящему — все это можно выразить гораздо точнее, эмоциональнее, если использовать фразеологизмы, а при этом показать свою эрудицию, даже если воспользоваться эвфемизмом.

К сожалению, в век компьютерных технологий и общения посредством технических средств молодые люди стали намного меньше использовать литературные источники и, как факт, соответственно неумело употреблять фразеологизмы и эвфемизмы в своей речи. Именно изучение этимологии фразеологизмов и эвфемизмов позволяет нам глубже понять историю и характер нашего народа, изучить многовековой опыт его трудовой и духовной деятельности, религиозные воззрения и верования, приобщиться к культурным ценностям. Таким образом, изучая фразеологизмы, школьник «впитывает» их как своего рода «кладезь мудрости» народа.

**Основная часть.** В соответствии с требованиями времени приоритетными задачами образования являются следующие: формирование общей культуры учащихся, духовно-нравственное, личностное и интеллектуальное развитие, создание условий для самостоятельной реализации учебной деятельности.

Исследований фразеологизмов и эвфемизмов с точки зрения русского языка множество, а изучение эвфемизмов и фразеологии в рамках школьного курса русского языка недостаточно рассмотрено.

Особый интерес в этом аспекте представляют работы по эвфемизмам в школьном окружении, потому что использование именно этого языкового средства позволяет выстроить положительную стратегию общения на любом уровне и в любой ситуации. Ведь при помощи эвфемизмов адресант очень часто сообщает свое представления о нормативности и ненормативности, о допустимом и недопустимом.

© Тавлуй А. А., Фабишевская В. О., 2023

Репозиторий БарГУ